**ПЯЧУ́РНІК**, дамавы дух, які жы́ве ў падпеччы ці ў запечку. Абліччам нагадвае ката, толькі ходзіць на задніх лапах, хоць чалавеку стараецца не паказвацца. Уяўляўся, як і *Дамавік*, апекуном дома, дзе жыў. У знак пашаны гаспадыня на ноч выстаўляла на печы пачастунак П.: рэшткі вячэры або малако. Калі ж да яго паставяцца без належнай увагі, П. ад суму, помсты ці крыўды будзе некалькі начэй запар выць і крычаць у коміне, грукатаць уюшкаю. Маючы здольнасць прадбачыць бяду і непрыемнасці ў гаспадроў дома, П. пачынае пасоўваць мэблю, скідваць і разбіваць посуд і тым самым папярэджваць іх пра небяспеку. Бывае, што П. ахвочы і пажартаваць: зносіць патрэбную рэч са звычнага месца ў інш. ці хавае яе. П. згадваўся на Маладзечаншчыне.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 560—561.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ